ЦЭНТРАЛЬНАЯ ГАРАДСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ К.МАРКСА

# «Чытаем па-беларуску разам!»

ВІРТУАЛЬНАЯ ВЫСТАВА

**21 лютага ва ўсім свеце адзначаецца**
**Міжнародны дзень роднай мовы.**

**Мілагучная, мяккая, цудоўная беларуская мова бярэ свой пачатак з даўніх часоў і, нягледзячы ні на што, працягвае жыць і гучаць.**

**Прапануем вам пазнаёміцца з новымі кнігамі знакамітых і пачынаючых беларускіх пісьменнікаў.**

**Запрашаем усіх прыхільнікаў беларускай кнігі наведаць цэнтральную гарадскую бібліятэку імя К.Маркса.**




# Баршчэўскі, Я.

## «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях»

Надзелены фенаменальнай фантазіяй і талентам прадбачання, Ян Баршчэўскі стаў адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры і ўзбагаціў яе, магчыма, адным з самых загадкавых і займальных твораў – кнігаю «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», у якой шырока выкарыстаны беларускія народныя казкі, легенды і паданні.




*Баршчэўскі, Я. Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Ян Баршчэўскі. — Мінск : Папуры, 2024. — 358 с.*




# Гаўрыловіч, У. М.
## «Сэрца сваё не падманеш…»

Тры раманы з палесскага цыкла ахопліваюць незабыўныя падзеі жыцця землякоў аўтара (турава-жыткавіцкі край) пачынаючы з 30-х гадоў мінулага стагоддзя, закранаюць перыяд Вялікай Айчыннай вайны і сённяшнія дні.

Каханне і здрада, адданасць справе і абыякавасць да існага, імкненне да справядлівасці і перадоленне ўсяго бесчалавечнага выяўляюць самыя розныя рысы характараў персанажаў, падкрэсліваючы: ніхто і нішто не можа скарыць наш народ, які жыве па адвечных законах дабра і справядлівасці.

*Гаўрыловіч, У. М. Сэрца сваё не падманеш... : трылогія / Уладзімір Гаўрыловіч. — Мінск : Беларусь, 2021. — 341 с.*




## Гніламёдаў, У. В.
## «Валошкі на мяжы»

Раман «Валошкі на мяжы» прысвечаны жыццю Заходняй Беларусі ў міжваеннае дваццацігоддзе ва ўмовах польскага санацыйнага рэжыму. Уладзімір Гніламёдаў знаходзіць новыя падыходы, меру праўдзівасці і рэалізму ў паказе сваіх герояў, іх жыцця, імкненняў, ахопе псіхалогіі чалавека і тых абставінаў, у якіх ён знаходзіцца. Раман выразна адлюстроўвае асабістасці менталітэту, нацыянальнай свядомасці беларускага народа, тое, што фарміравалася на працягу многіх гадоў сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчам гэтага краю.



*Гніламёдаў, У. В. Валошкі на мяжы : раман / Уладзімір Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 572 с. — (Беларуская проза XXI стагоддзя).*




# Корнева, П. Д.
# «Запіскі юнай хірургіні»

«Запіскі юнай хірургіні»— кніга маладой аўтаркі і будучага доктара. Змешчаныя ў зборніку апавяданні шчыра раскрываюць медыцынскі свет з некалькіх ракурсаў: як вачамі простага чалавека, так і дзяўчыны, што выбрала для сябе адну з самых складаных прафесій.



*Корнева, П. Д. Запіскі юнай хірургіні : апавяданні / Паліна Корнева. — Мінск : Звязда, 2025. — 181 с.*




## Латышкевіч М. Ю.
## «Вершнікі на дарозе»

У дзівосным свеце аповесцей фэнтэзі Маргарыты Латышкевіч ажываюць легенды, спяваюць рунічныя камяні і нараджаюцца чары. Народ Курганова Поля – паэты, ведзьмары, ваяры – процістаяць людзям. Але ці настолькі адрозныя народ Курганоў і чалавечыя сыны?..

Верасовыя пусткі напаўняюцца музыкай ветру, магія пранізвае час і прастору. Вершнікі ўжо на шляху…

*Латышкевіч, М. Ю. Вершнікі на дарозе : аповесці / Маргарыта Латышкевіч. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. —268 с. — (Серыя «Фантастыка і фэнтэзі»)*



# Марчук, Г. В. «Мокры снег»

У кнігу ўвайшлі тры раманы, галоўныя героі якіх сучасныя людзі: былы акцёр Максім Дамарад («Мокры снег»), псіхолаг Андрэй Дубрава («Першыя ландышы»), мастак Петр Краўчук («Цеплы дождж»). Розныя выпрабаванні паўстаюць на іх жыццёвых шляхах, неаднолькавыя праблемы яны вырашаюць. Кожны з іх вядзе свой асабісты пошук пераходу ад стану духоўнага крызісу, разбурэння особы да душэйнай гармоніі, веры ў свае сілы і здзяйснення маленькіхі вялікіх мэт. Іх паступовыя перамогі садзейнічаюць поспеху іншых персанажаў, якія так ці інакш звязаны з галоўнымі героямі.



*Марчук, Г. В. Мокры снег : раманы / Георгій Марчук. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2021. — 318 с.*






## Рублеўская, Л. І.
## «Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата»

Падзеі напачатку рамана адбываюцца ў Францыі, а затым пераносяцца ў Беларусь. Галоўныя героі шукаюць спосаб выжыць у падводнай лодцы, выратоўваць на судзе Саламею Лёднік, б’юцца з Германам Ватманам, працуюць як двайныя агенты і на канфедэратаў, і на караля. Іх чакае сустрэча з егіпецкай прынцэсай, вандроўка ў вадзяным змеі ў падземных азёрах пад Туравам, спроба разгадаць таямніцу шлема арабскага лекара Альбукасіса…

*Рублеўская, Л. І. Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата : раман прыгодніцкі і фантасмагарычны / Людміла Рублеўская. — Мінск : Звязда, 2017. — 365 с. — (Святло мінуўшчыны)*




## Сіпакоў, Я.
## «Зялены лісток на планеце Зямля»

«Зялёны лісток на планеце Зямля» лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь Янкі Сіпакова – самабытная энцыклапедыя нашага краю і нашага жыцця. Гэта не лірыка, але ўся кніга прасякнутая лірычнасцю, замілаванасцю, любоўю да Беларусі.

*Сіпакоў, Я. Зялены лісток на планеце Зямля : эсэ / Янка Сіпакоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2023. — 277 с. — (Бібліятэка выбраных твораў).*




# **Шамякін, І. П. «Трывожнае шчасце»**

У аповесцях «Непаўторная вясна», «Начныя зарніцы», «Агонь і снег» пенталогіі «Трывожнае шчасце» народны пісьменнік Беларусі Іван Шамякін на аснове ўласна перажытага паказаў лёс усяго пакалення, якое прайшло праз цяжкія выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны і ў нялёгкіх пасляваенных умовах аднаўляла родны край.

*Шамякін, І. П. Трывожнае шчасце : пенталогія / Іван Шамякін : Т. 1 : . — Мінск : Звязда, 2025— Непаўторная вясна; Начныя зарніцы; Агонь і снег : аповесць першая. — 2025. — 429 с.*






# Шніп, В. А.
## «Заўтра была адліга — 4 : дзеннікавы раман паэта»

«Заўтра была адліга — 4» — працяг дзённікавага рамана паэта пра штодзённасць, якую ўсе мы пражываем і часта нічога для памяці не заўважаем. Аўтар не толькі заўважыў, але і занатаваў яркія моманты з быцця сваіх родных і блізкіх, нечаканыя факты з біяграфій вядомых людзей, мітрэнгі рэдактарскай працы, вандроўкі ў снах і наяве, а таксама вершы, якія нечакана прыдумаліся ў дарозе. І ўсё гэта разам сплялося ў цікавую празаічна-паэтычную гісторыю, чытаючы якую можна і засмяяцца, і заплакаць, і задумацца.

*Шніп, В. А. Заўтра была адліга — 4 : дзеннікавы раман паэта / Віктар Шніп. —Мінск : Звязда, 2024. — 276 с.*